**Пашэвіч, В.** Як жывеш, шураві? / В. Пашэвіч // Родныя вытокі. — 1994. — 12 лют. — С. 2.

# ЯК ЖЫВЕШ, ШУРАВІ?



«Шураві» – слова, якое, быццам пароль, звязвае ўсіх былых воінаў-афганцаў. Яно было, мабыць, першым, якое яны пачулі на чужыне. Па-афганску «шураві» – азначае рускі, савецкі. Так там называлі ўсіх нашых салдат – рускіх, беларусаў, украінцаў... Нярэдка да гэтага дадавалі яшчэ адно слова – «бача», што значыць — хлопчык, юнак.

Менавіта такім бязвусым, нявопытным «бача шураві» пайшоў у армію і Мікалай Маслоўскі з Порплішча. Месцам ягонай службы Афган, дакладней – Бадахшан. Перад самай дэмабілізацыяй, 15 мая 1987 года, быў паранены, кантужаны. Чатыры месяцы правёў у шпіталі ў Душанбе, крыху падлячыўся і вярнуўся дадому. Адразу трапіў у супярэчлівы свет чалавечых узаемаадносін. Многае, на што раней не звяртаў увагі, паўстала перад хлопцам у выглядзе бясконцых праблем, цяжкасцей, непаразуменняў.

Здаровы малады чалавек раптам стаў інвалідам, атрымаў II групу, пенсію. У 21 год будучыня пачала здавацца беспрасветнай. Пакуты ад нясцерпных галаўных боляў прымусілі штогод працяглы тэрмін праводзіць у бальніцах у Бягомлі, Докшыцах, Віцебску.

– І цяпер улетку прапануюць з'ездзіць у санаторый. Адчуваю, што мне гэта неабходна. Але перад гэтым трэба паляжаць у бальніцы. А як мне спалучаць клопаты аб асабістым здароўі і штодзённыя вясковыя? – уздыхае Мікалай.

Можа, прасцей было, калі быў М. Л. Маслоўскі халасцяком, жыў разам з маці, братамі і сёстрамі ў новым доме, пабудаваным для яго як інваліда-афганца саўгасам. Але з'явілася свая сям'я – жонка і трое дзяцей. Пенсія яго невялікая – у гэтым месяцы 87 тысяч рублёў. Да гэтага была і яшчэ меншая. Як канцы з канцамі зводзіць?

– Пенсію назначылі, такія-сякія льготы ўстанавілі – на гэтым увага да такіх, як я, заканчваецца. Але ж мы жывыя людзі, нам увесь час дапамога патрэбна. – Як мне ні балюча прызнавацца, асабіста я часцяком з-за хваробы з прасцейшай работай справіцца не магу, – кажа Мікалай.

Некаторыя шкадуюць і спачуваюць яму. А вось наконт дапамогі…Першай падтрымкай, зразумела, яму павінны быць родныя – не толькі жонка, якая пераклала на свае плечы большую частку ношы, але і маці, і дарослыя сёстры, браты, якія жывуць па-суседству. Але, як скардзідца

Мікалай, браты кажуць прама: за дапамогу стаў гарэлку. Не ўстане – рабі сам. Восенню бульбу капалі цэлы тыдзень удваіх з жонкай, ніхто не дапамог. Праўда, за плату знаходзіліся чужыя людзі, прывозілі накапаную за дзень бульбу з поля дадому.

А клопатаў у Мікалая Маслоўскага многа. У сакавіку будзе год, як пераехала сям'я ў новы асобны дом. Але мала радасці ў чалавека і ад гэтай, быццам бы прыемнай падзеі. Як расказвае жонка Маслоўскага – Людміла, каб можна было перасяліцца сюды, унутраныя работы заканчвалі самі – клеілі шпалеры, фарбавалі падлогу, клалі падлогу ў кухні. Гарышча да гэтай пары пустое, таму ў хаце вельмі холадна, гадавалую Ірынку як ні апранаюць, усё роўна часта прастывае. І будынак халодны, і паліва заканчваецца.

Брыкет, прывезены Маслоўскаму на льготных умовах у час разводдзя, калі двор інваліда ператвараецца, па яго словах, у багну, сапсаваўся ад вады. З трох тон удалося сабраць для выкарыстання толькі адну. З патрэбных 6–7 прычэпаў пяску для падсыпкі дварышча пасля неаднаразовых просьбаў прывезлі адзін прычэп. Гэтым становішча не выправіш.

Да гэтага часу не абгароджаны ў былога воіна-афганца агарод, плот стаіць напалову. Не дабудавана веранда ў доме. У варыўні – недаробленая, нават пажаранебяспечная пліта, якой вымушаны карыстацца. Хацелася б трымаць карову – няма дзе паставіць, ды і нарыхтоўка сена турбуе: ці дапамогуць гатовым у гаспадарцы? Ёсць патрэба ў сваёй лазні, каб хворы чалавек мог памыцца, калі захоча і зможа, а не падстройваўся пад агульны расклад. Але ўсё, нават маленькая, работа, дробязная справа прыносіць вялікія цяжкасці, патрабуе звяртацца да многіх людзей, прасіць, настойваць, нярэдка нават сварыцца.

Акрамя родных, шукае вясковы жыхар звычайна падтрымку ў сельскім Савеце, за дапамогай звяртаецца ў племзавод. Не задаволены дапамогай племзавода «Порплішча» Мікалай Лявонавіч Маслоўскі. Ад слова, як кажа Мікалай, дапамаглі тут сёлета толькі парасят набыць, якіх яму выдзелілі як і спецыялістам гаспадаркі. У астатніх выпадках заўсёды былі нейкія недарэчнасці, непаразуменні, канфлікты. Больш, на думку Маслоўскага, дапамагае яму намеснік старшыні райвыканкама І. М. Палачанін.

А вось як тлумачыць гэту сітуацыю дырэктар племзавода «Порплішча» Вальдэмар Антонавіч Падляшчук.

– Гаспадарка, нават у крытычным становішчы, у якім знаходзіцца сама, па магчымасці дапамагае. Без чаргі інвалід-афганец атрымаў дом, прычым ужо ў другі раз. Канчатковы рамонт дарабляў сам па асабістаму жаданню. Для ўцяплення гарышча яму прывезены апілкі, за лета, думаю, у іх гэта пытанне вырашыцца. У астатнім іх дом нічым не адрозніваецца ад іншых. Па іх просьбе зроблена каналізацыя, вадзяное ацяпленне. Лазні, ванныя мы не будуем нікому. Гэта – справа саміх жадаючых. Веранды, якія ў такіх дамах не прадугледжаны праектам, дабудоўваюцца зноў жа самімі гаспадарамі. Наконт каровы хачу папярэдзіць – большая частка адказнасці па яе ўтрыманню ляжыць на саміх гаспадарах.

З плотам дапаможам, агарод іх будзе абгароджаны. Па гэтаму пытанню была дамоўленасць з Маслоўскім толькі аб саўгасных матэрыялах, але, калі ўзніклі цяжкасці з гэтым, вырашым. Магу паабяцаць дапамогу і з сельгасработамі, сяўбой і іншымі, апрацоўкай іх зямельных участкаў. Але асноўны клопат у сацыяльнай абароне інвалідаў-афганцаў, іх інтарэсаў павінна браць на сябе дзяржава. Калі ўрад мала ўвагі ўдзяляе гэтай праблеме, чаму вінаватымі павінны быць гаспадарнікі?

Чым зможа, паабяцаў дапамагаць інваліду II групы і старшыня Порплішчанскага сельскага Савета Сцяпан Давыдавіч Каляга. У Порплішчанскім сельсавеце пражывае 11 інвалідаў Вялікай Айчыннайі вайны, адзін інвалід-афганец. У падтрымцы мае патрэбу кожны з іх. Сельскі Савет – звязваючае звяно. Таму старшыня і заклікаў да ўзаемаразумення.

Не менш за хваробу ўздзейнічае на чалавека яго бездапаможнасць.

– Нярэдка чуеш, што з нас ўжо ў вёсцы смяюцца, – расказвае Людміла Маслоўская. – Колю шкодна хвалявацца, адразу дрэнна робіцца. Таму замест яго часцей пішу, тэлефаную, езджу, звяртаюся ва ўсе магчымыя ўстановы. Упэўніліся: сам не паварушышся – нічога не атрымаеш, ніхто не дапаможа.

Вось і мяркуйце: ці лепш заставацца сарамлівым і сціплым, задавальняцца малым, не вылучацца з масы, ці змагацца за свае правы, браць на ўзбраенне рашучасць і настойлівасць, нават, калі абзываюць «нахабнікам», чагосьці дамагацца для сябе і за кошт гэтага жыць лепш. У такіх умовах, перад такім выбарам жыве сёння большасць былых «шураві». Як палепшыць іх жыццё? Можа, ёсць прапановы ў вас, паважаныя чытачы?

**В. Пашэвіч**

**На здымку**: інвалід II групы, былы воін-афганец Мікалай Маслоўскі з дачкой Ірынкай.

**Фота**: **В. Кажамячонка**